УДК 378.147

*ШАРАПАВА А.В.*

**АСАБЛІВАСЦІ ФАРМІРАВАННЯ ГРАМАДЗЯНСКА-ПАТРЫЯТЫЧНЫХ КАМПЕТЭНЦЫЙ У СІСТЭМЕ ПАДРЫХТОЎКІ БУДУЧЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ У БЕЛАРУСКА-РАСІЙСКІМ ЎНІВЕРСІТЭЦЕ**

***Шарапава А.В.***
старшы выкладчык кафедры МАУВА «Беларуска-Расійскі ўніверсітэт»
(г. Магілёў, Рэспубліка Беларусь)

На сучасным этапе развіцця грамадства асаблівую актуальнасць набывае педагагічная дзейнасць, скіраваная на фарміраванне грамадзянска-патрыятычнай пазіцыі маладой асобы. Пра гэта гаварыў і Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка ў сваім штогадовым Пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу ад 24 красавіка 2018 г. Згадваючы маладых людзей, што перад усім светам дэманструюць прыклады сапраўднага патрыятызму, глава дзяржавы адзначыў: “Такі сапраўдны патрыятызм. Пра яго не разважаюць, з ім жывуць у сэрцы. Нізкі паклон тым бацькам, што вырасцілі такіх дзяцей, і ўдзячнасць педагогам, што выхавалі сапраўдных беларусаў. Гэта не першыя і, упэўнены, не апошнія парасткі нацыянальнай самасвядомасці. Для нас яны самыя дарагія, таму што зарадзіліся ў чыстых і шчырых дзіцячых душах, сталі жывым пацверджаннем таго, што мы зрабілі гэта – стварылі моцную і незалежную дзяржаву”[5] [1].

Канцэпцыя бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь вызначае асноўныя прыярытэты выхавання ва ўстановах адукацыі краіны. Усе яе складнікі выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі (ідэалагічнае, грамадзянскае і патрыятычнае, духоўна-маральнае, полікультурнае, эканамічнае і інш.) арыентуюцца на фарміраванне ў навучэнцаў важных агульначалавечых каштоўнасцяў. У якасці асноўных прыярытэтаў выхавання ў Канцэпцыі замацавана паслядоўнае і актыўнае садзейнічанне станаўленню грамадзяніна і патрыёта сваёй краіны [2]. Падпраграма 11 “Маладзёжная палітыка” Дзяржаўнай праграмы “Адукацыя і маладзёжная палітыка” на 2016 – 2020 гады ў якасці задачы № 1 вылучае “фарміраванне ў моладзі актыўнай грамадзянскай пазіцыі і патрыятызму, яе ўцягванне ў актыўную грамадскую дзейнасць” [3].

У межах рэфармавання вышэйшай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь важнае значэнне надаецца развіццю ў будучых спецыялістаў акадэмічных, прафесійных, сацыяльна-асобасных, у тым ліку грамадзянска-патрыятычных, кампетэнцый. Для іх фарміравання важнае значэнне набывае ўзаемадзеянне розных формаў і метадаў навучання ў працэсе засваення вучэбных дысцыплін “Беларуская мова (прафесійная лексіка)”, “Беларуская мова (культура мовы)”, якая рэалізуецца на штотыднёвых занятках першакурснікаў, а таксама ў пазааўдыторны час. Гэтыя дысцыпліны маюць найбольшыя магчымасці для рэалізацыі выхаваўчых і ідэалагічных задач, асабліва ва ўмовах універсітэта негуманітарнага профілю. Пры гэтым выкарыстоўваюцца разнастайныя формы і метады работы, праекты і мерапрыемствы, што структураваны на аснове дыдактычных прынцыпаў паслядоўнасці і сістэматычнасці, даступнасці і нагляднасці. Фарміраванне грамадзянска-патрыятычных кампетэнцый навучэнцаў у Беларуска-Расійскім універсітэце адбываецца паслядоўна, уключае ў сябе некалькі этапаў.

Праект “Мой Магілёў”. Ніякая нацыянальная культура не з’яўляецца “рэччу ў сабе”, яна ёсць складнік ўніверсуму, прыналежнасць да якога вызначаецца разгалінаванай сістэмай узаемасувязяў усіх сфер жыцця. Важным элементам апошняга з’яўляецца такое ключавое паняцце, як Радзіма – вялікая і малая. Таму адна з важных задач сучаснай адукацыйнай педагагічнай сістэмы –асэнсаванне названага канцэпта. Адбываецца падобны працэс

[5] Тут і далей пераклад з рускай мовы аўтара – А.Ш.



Электронная библиотека Белорусско-Российского университета
http://e.biblio.bru.by/

паступова і паэтапна. Розныя формы работы дапамагаюць навучэнцам, асабліва студэнтам I курса, хутчэй прайсці працэс адаптацыі ў новым калектыве, на новым месцы пражывання. Беларуска-Расійскі ўніверсітэт і Магілёў становяцца для маладога чалавека важным этапам, пра якія ён яшчэ доўгі час будзе ўзгадваць. Важна, каб і праз гады гэты ўніверсітэт і горад чалавек мог назваць сваёю малою радзімай.

У межах названага праекта праводзіцца шэраг экскурсій па сістэме перспектыўных ліній. Спачатку гэта аглядавае знаёмства з універсітэтам, яго структурай, гісторыяй стварэння. У час экскурсій па горадзе Магілёве навучэнцы атрымліваюць больш інфармацыі, у тым ліку і пра будынак універсітэта, яго архітэктурныя асаблівасці, першапачатковае прызначэнне. Пры наведванні музеяў і выстаў, акрамя іншых звестак, студэнтам паведамляюць пра ролю іх alma mater у грамадска-палітычным і эканамічным жыцці рэгіёна, пра развіццё прамысловасці горада і рэспублікі ў цэлым. Такім чынам, кожная новая экскурсія дае магчымасць зноў звярнуцца да гісторыі навучальнай установы, асэнсаваць яе ролю ў гісторыі краіны і жыцці асобнага чалавека.

Грамадзянска-патрыятычнае выхаванне навучэнцаў немагчыма без далучэння да духоўных традыцый народа. Таму для студэнтаў-першакурснікаў усіх спецыяльнасцяў арганізоўваюцца экскурсіі ў Магілёўскі Свята-Мікольскі жаночы манастыр. Такім чынам у навучальнай установе рэалізуецца “Праграма супрацоўніцтва паміж Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь і Беларускай праваслаўнай царквой на 2015 – 2020 гады” [4]. На экскурсіях асвятлюцца наступныя пытанні: гісторыя ўзнікнення манастыра, асаблівасці архітэктуры манастырскага комплекса, няпросты лёс абіцелі ў савецкія часы і адраджэнне яе ў канцы XX ст., славутыя асобы, звязаныя з манастыром, Свята-Мікольскі манастыр як духоўны цэнтр Магілёўшчына і Беларусі і г.д.

Ведаць той горад, дзе вучышся, немагчыма без ведання яго выбітных мясцін, архітэктурных помнікаў, тэатраў і музеяў. Таму важнае значэнне ў межах фарміравання сацыяльна-асобасных кампетэнцый, у межах грамадзянска-патрыятычнага і духоўна-маральнага выхавання займае мастацтва. Навучэнцы абавязкова наведваюць беларускамоўныя пастаноўкі тэатраў Магілёва. Пры гэтым яны слухаюць узорнае беларускае маўленне, знаёмяцца з творчасцю беларускіх драматургаў і рэжысёраў, асэнсоўваюць п’есы, вучацца правільна паводзіць сябе, дарэчна апранацца. За апошнія гады студэнты наведалі многія беларускамоўныя пастаноўкі Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра і Магілёўскага абласнога тэатра лялек**.** Абмеркаванне спектакляў працягваецца на занятках, абуджае жаданне перачытаць ці прачытаць творы, становіцца яшчэ адной прычынай для гонару за родную літаратуру, культуру, беларускіх мастакоў і акцёраў – за сваю Радзіму.

Адной з формаў выхаваўчай работы ва ўніверсітэце з’яўляецца арганізацыя літаратурных тыдняў, што прысвечаны юбілеям беларускіх пісьменнікаў. Праграмы тыдняў прадугледжваюць як традыцыйныя − конкурс насценнага друку, правядзенне віктарыны па жыцці і творчасці пісьменніка, спаборніцтва чытальнікаў мастацкіх твораў аўтара, так і не зусім характэрныя для студэнтаў нефілалагічнага профілю мерапрыемствы − конкурс на лепшую відэапрэзентацыю твора пісьменніка ў сацыяльнай сетцы, стварэнне і прэзентацыя шырокаму колу чытачоў літаратурнага эсэ, прысвечанага юбіляру, флэшмоб, які пэўным чынам звязаны з пісьменнікам. Напрыклад, флэшмоб “Верш на сцяне”: у Магілёве шэраг беларускіх вершаў і малюнкі да іх былі размешчаны на сценах будынкаў горада. Адзін з вершаў – славуты твор Яўгеніі Янішчыц “Ты пакліч мяне, пазаві…”. Студэнты атрымалі заданне: знайсці арт-аб’ект, сфатаграфавацца на яго фоне, зрабіўшы гэта арыгінальна і творча, размясціць фота ў сацыяльнай сетцы “ВКонтакте” ў групе “Беларуская, руская і замежныя мовы”. Шляхам падліку падабаек і рэпостаў было вызначана і ўхвалена лепшае фота. Відэаролікі, а таксама фота- і відэасправаздачы Тыдняў можна пабачыць у суполцы: #мойбагдановіч, #нашыкласікі, #Яўгенія_Янішчыц.

Адной з задач Праграмы бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі [5] з’яўляецца арганізацыя і правядзенне мерапрыемстваў, прысвечаных дзяржаўным святам і памятным датам. Важным у кантэксце ідэалагічнага і грамадзянска-патрыятычнага



Электронная библиотека Белорусско-Российского университета
http://e.biblio.bru.by/

выхавання з’яўляецца святкаванне Міжнароднага дня роднай мовы. Штогод рэалізуецца адукацыйна-асветніцкі праект “Жывая мова”, у межах якога праводзіцца цэлы шэраг мерапрыемстваў: конкурс чытальнікаў “Сучасная беларуская лірыка”, студэнцкія навуковыя канферэнцыі. Навучэнцы і выкладчыкі могуць праверыць свае веды, прыняўшы ўдзел у Вялікай беларускай дыктоўцы, якая традыцыйна праводзіцца сумесна з кафедрай беларускай і рускай моў БДМУ, і ў Беларускай дыктоўцы, што арганізуе магілёўская абласная арганізацыя грамадскага аб’яднання “Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны”. У якасці тэкстаў для апошняй абіраецца твор пісьменніка-юбіляра, які родам з Магілёўшчыны.

Важнае значэнне мае інфармацыйна-папулярызатарская дзейнасць. Адна з запатрабаваных сетак у вучнёўскім, студэнцкім асяроддзі Беларусі – сетка “ВКонтакте” (vк.com), што арыентавана найперш на моладзь, мае добрыя мультымедыйныя магчымасці. Для інфармавання і каардынацыі дзеянняў студэнтаў у названай сетцы была створана група з агульнай назвай “Беларуская, руская і замежныя мовы”. Дзякуючы ёй ажыццяўляецца інфармаванне навучэнцаў, мадэрацыя і абмеркаванне разнастайных мерапрыемстваў і праектаў. Таксама пра рэалізаваныя праекты і мерапрыемствы можна прачытаць на афіцыйным сайце Беларуска-Расійскага ўніверсітэта і на старонках ўніверсітэцкай газеты “Параллель”.

Выхаванне ва ўстановах вышэйшай адукацыі мае свае асаблівасці. У навучэнцаў ужо ёсць пэўныя светапоглядныя асновы, маральна-этычныя нормы, эстэтычныя ідэалы. Але працэс фарміравання асобы яшчэ не завершаны. Ён будзе працягвацца пад уплывам выкладчыка, вучэбных прадметаў, куратара, студэнцкага асяроддзя, нарэшце, правільна арганізаванай выхаваўчай работы ўстановы адукацыі. Падобнае комплекснае ўздзеянне дапаможа будучаму спецыялісту атрымаць неабходныя кампетэнцыі.

Беларуская нацыянальная ідэя – “За моцную і квітнеючую Беларусь”. Асноўным зместам яе з’яўляюцца такія важныя паняцці, як агульначалавечыя і хрысціянскія каштоўнасці, нацыянальна-дзяржаўная самасвядомасць, грамадзянскасць, патрыятызм, павага да людзей іншых нацыянальнасцяў і канфесій, талерантнасць, гуманізм, працалюбства і міралюбства. Адпаведнасць зместу сацыяльна-асобасных кампетэнцый аспектам нацыянальнай ідэі дазваляе захоўваць пераемнасць мэтаў і прыярытэтаў маладзёжнай палітыкі Рэспублікі Беларусь [6], дапамагае ажыццявіць выхаванне сацыяльна паспяховай і прафесійна кампетэнтнай асобы, спрые паслядоўнаму і актыўнаму садзейнічанню ў станаўленні грамадзяніна і патрыёта сваёй краіны.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Послание Президента Республики Беларусь А.Г. Лукашенко белорусскому народу и Национальному собранию Республики Беларусь 24 апреля 2018 г. [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://pravo.by/document/?guid=3871&p0=P018p0001. – Дата доступа : 12.04.2019.
2. Концепция непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи в Республике Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://mp.minsk.edu.by/main.aspx?guid=6581. – Дата доступа : 11.04.2019.
3. Государственная программа «Образование и молодежная политика» на 2016 – 2020 годы [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.govemment.by/upload/docs/file2b2ba5ad88b5b0eb. – Дата доступа : 20.04.2019.
4. Программа сотрудничества между Министерством образования Республики Беларусь и Белорусской Православной Церковью на 2015 – 2020 годы [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://adu.by/ru/rukovoditelyam/organizatsiya-vospitaniya.html. – Дата доступа : 23.04.2019.
5. Программа непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи на 2016 – 2020 гг. [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://adu.by/ru/rukovoditelyam/organizatsiya-vospitaniya.html. – Дата доступа : 01.04.2019.




Электронная библиотека Белорусско-Российского университета
http://e.biblio.bru.by/

6. Государственная программа «Образование и молодежная политика» на 2016 – 2020 годы [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.govemment.by/upload/docs/file2b2ba5ad88b5b0eb. – Дата доступа : 20.04.2019.

УДК 316.42

*ШАРЫЙ И.Н.*

**ГОСУДАРСТВЕННАЯ ПОДДЕРЖКА МОЛОДЫХ УЧЕНЫХ В КОНТЕКСТЕ ОБЕСПЕЧЕНИЯ НАЦИОНАЛЬНОЙ БЕЗОПАСНОСТИ В НАУЧНО-ТЕХНИЧЕСКОЙ СФЕРЕ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

***Шарый И.Н.***
заведующий сектором Института социологии НАН Беларуси,
кандидат социологических наук
(г. Минск, Республика Беларусь)

В соответствии с Концепцией национальной безопасности Республики Беларусь к основным национальным интересам в научно-технологической сфере относится формирование экономики, основанной на знаниях. Обеспечение развития научной сферы рассматривается как база устойчивого инновационного развития Республики Беларусь [1, с. 9] В соответствии с Концепцией к числу внутренних угроз национальной безопасности отнесена неблагоприятная возрастная структура научных кадров [1, с. 20].

Для преодоления негативных тенденций, сохранения и развития кадрового потенциала белорусской науки особое значение имеет государственная поддержка научной молодежи, обеспечивающая приток и закрепление в сфере науки наиболее перспективных молодых ученых. В формировании молодежной политики в сфере науки Республики Беларусь можно выделить несколько этапов. В первой половине 90-х годов необходимо было создать нормативно-правовую базу, регулирующую развитие научной сферы в стране. С 1992 по 1994 гг. первоочередные задачи в области науки состояли в преодолении деструктивных тенденций, что нашло отражение в Законе РБ «Об основах государственной научно-технической политики» (1993 г.) и Постановлении Кабинета министров «О мерах по сохранению и эффективному использованию научного потенциала Республики Беларусь» (1994 г.). На этом этапе кадровая политика в сфере науки была направлена на сохранение системы подготовки научных кадров высшей квалификации.

Во второй половине 90-х годов произошел переход к «активному» типу политики в области воспроизводства кадрового состава науки, для которого характерно приоритетное развитие очной формы обучения в аспирантуре, ориентация на высокие темпы роста численности аспирантов. С середины 90-х годов в республике были приняты дополнительные меры по поддержке научной молодежи, студентов и учащихся. В соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 12 января 1996 г. № 19 был создан Специальный фонд Президента Республики Беларусь по социальной поддержке одаренных учащихся и студентов. Цель фонда – финансирование мероприятий, направленных на стимулирование интеллектуально-творческой деятельности молодежи в области образования и науки.

Совершенствованию системы государственной поддержки научной молодежи способствовало принятие Указа Президента Республики Беларусь от 11.08.2005 № 367 «О совершенствовании стимулирования творческого труда молодых ученых» в соответствии с которым было учреждено 100 стипендий Президента Республики Беларусь талантливым молодым ученым, работающим в организациях, выполняющих научные исследования и разработки в области естественных, технических, социальных и гуманитарных наук. С 2006

Электронная библиотека Белорусско-Российского университета
http://e.biblio.bru.by/